Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі"

# Фарміраванне чытацкай адукаванасці як аснова выхавання і развіцця асобы навучэнца сродкамі вучэбных прадметаў "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"



Матэрыялы абласнога семінара

Гомель, 2024

**Удзельнікі семінара:** метадысты ўстаноў (арганізацый), якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, кіраўнікі ВМА, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры

**Дата правядзення:** 17 кастрычніка 2024 года

**Месца правядзення:** ДУА "Глінішчанская сярэдняя школа імя І.П.Мележа" Хойніцкага раёна

**Форма правядзення:** семінар-практыкум

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў у фарміраванні чытацкай адукаванасці навучэнцаў, выхаванні і развіцці іх асобы сродкамі вучэбных прадметаў "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

**Задачы:**
стварыць умовы для засваення педагогамі актуальных для сістэмы адукацыі вобласці праблем арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры і вызначэння шляхоў і рэзерваў іх пераадольвання;
актуалізаваць веды педагагічных работнікаў аб сутнасці чытацкай адукаванасці і шляхах яе фарміравання;
пашырыць уяўленні педагогаў аб выкарыстанні сродкаў музейнай педагогікі і вучэбнага праектавання для выхавання і развіцця асобы навучэнца;
прадэманстраваць прадуктыўны педагагічны вопыт выкарыстання ў адукацыйным працэсе эфектыўных метадаў, сродкаў і форм навучання, якія садзейнічаюць фарміраванню чытацкай адукаванасці навучэнцаў, выхаванню і развіццю іх асобы.

## Парадак правядзення семінара

| | | |
|---|---|---|
| **09.00 - 10.00**<br>фае 1-га паверха | **Рэгістрацыя ўдзельнікаў семінара** | |
| | *Габава*<br>*Анастасія Аляксандраўна* | *метадыст ДУ "Хойніцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет"* |
| **09.00 - 10.00**<br>фае 1-га паверха | **Работа выставы "Ад захаплення творчасцю – да захавання мовы"** | |
| | *Кананевіч*<br>*Галіна Васільеўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА "Судкоўская сярэдняя школа" Хойніцкага раёна* |
| **10.00 - 10.15**<br>каб. 1 | **Адкрыццё семінара** | |
| | *Сторaж*<br>*Святлана Іванаўна* | *начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ДУА "Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі" (далей – ГАІРА )* |

**10.15 - 12.00** **ГАЛЕРЭЯ ВОПЫТУ РАБОТЫ НАСТАЎНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ХОЙНІЦКАГА РАЁНА “ВЫХАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ”**

**10.15 – 11.00** дом-музей І.Мележа

**Урок у музеі з анлайн-трансляцыяй для педагогаў вобласці. Урок беларускай літаратуры ў 10 класе “Звесткі пра жыццё і творчасць Івана Мележа. Раман «Людзі на балоце»: творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка”**

*Анісенка Святлана Васільеўна* — *настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №3 г.Хойнікі“*

**11.00 – 11.30** сядзіба

**Інтэрактыўная пляцоўка “Глінішчанскае падвор’е”**

*Валенчыц Наталля Фёдараўна* — *настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Казялужская сярэдняя школа“*

**11.30 - 12.00** каб. 2

**Фрагмент факультатыўнага занятка ў 6 класе “Лінгвістычная мазаіка ці Паўтарэнне вывучанага ў 5 класе (з выкарыстаннем тэкстаў твораў І.П.Мележа)”**

*Гардзіенка Галіна Мікалаеўна* — *настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Глінішчанская сярэдняя школа імя І.П.Мележа“*

**12.00 – 14.30** **ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І ПРАКТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА ПЕДАГОГАЎ ПА ФАРМІРАВАННІ ЧЫТАЦКАЙ АДУКАВАНАСЦІ ЯК АСНОВЫ ВЫХАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ ВУЧНЯ**

**12.10 – 12.40** каб. 2

**Стан выкладання беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Гомельскай вобласці: асноўныя тэндэнцыі, праблемы і перспектывы развіцця**

*Сторож Святлана Іванаўна* — *начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ГАІРА*

**12.40 – 13.10** каб. 3

**Майстар-клас “Вучэбны праект: ад даследавання да творчасці”**

*Есіс Яўген Валер’евіч* — *настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі настаўнік-метадыст ДУА “Сярэдняя школа №16 г.Мазыра”*

**13.10 – 13.40** каб. 3

**Майстар-клас “Тэкст як сродак фарміравання чытацкай адукаванасці”**

*Яўсеенка Ірына Віктараўна* — *настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі настаўнік-*

*метадыст ДУА “Рэчыцкі раённы ліцэй”*

**13.40 - 14.00** **Падвядзенне вынікаў семінара. Абмен думкамі**
каб. 3 *Сторaж Святлана Іванаўна* — *начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ГАІРА*

## Урок беларускай літаратуры ў 10 класе

**Тэма.** Звесткі пра жыццё і творчасць Івана Мележа. Раман “Людзі на балоце”: творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка

**Мэта і задачы ўрока:** стварыць умовы для засваення вучнямі звестак пра жыццё і творчасць І.П.Мележа, засярodзіць увагу на творчай гісторыі, тэматыцы і праблематыцы рамана “Людзі на балоце”; удасканальваць навыкі выразнага чытання і аналізу мастацкага тэксту, уменне ўспрымаць паведамленні настаўніка, аднакласнікаў і экскурсавода;

садзейнічаць развіццю звязнага маўлення, увагі, памяці, фарміраванню камунікатыўнай культуры вучняў;

стварыць умовы для выхавання павагі да асобы знакамітага земляка І.П.Мележа, цікавасці да яго творчай спадчыны.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Форма правядзення ўрока:** урок-экскурсія.

**Абсталяванне:** экспанаты Дома-музея І.П.Мележа, Мележ, І.П. Людзі на балоце: раман з «Палескай хронікі»: для ст. шк. узросту / Іван Мележ; прадм. С.Андраюка. – Мінск: Маст. Літ., 2009. – 414 с.; мультымедыйная прэзентацыя, дыдактычны раздатачны матэрыял (аркушы з заданнямі, міні-тэстам), «Ліст падзякі».

### Ход урока

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

**1.** *Арганізацыйны момант. Стварэнне станоўчага псіхалагічнага настрою.*

**Настаўнік.** Добры дзень, паважаныя вучні! Я рада вітаць вас у Доме-музеі І.П.Мележа, дзе сёння пройдзе наш урок беларускай літаратуры.

**2.** *Паведамленне тэмы і задач ўрока.*

**Настаўнік.** Нам вельмі пашанцавала, што мы з’яўляемся землякамі гэтага славутага пісьменніка. І сёння мы з вамі прыадкрыем таямніцы жыццёвага шляху І.П.Мележа, дакранемся да яго творчай спадчыны, акцэнтуем увагу на рамане “Людзі на балоце”. Ітак, тэма нашага ўрока – **“Звесткі пра жыццё і творчасць Івана Мележа. Раман “Людзі на балоце”: творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка”.**

Наш урок пройдзе ў форме экскурсіі і будзе ўяўляць сабой сумесную працу мяне як настаўніка, вас як вучняў і Любоў Іванаўны Рубан як дырэктара гэтага музея і экскурсавода. Будзьце вельмі ўважлівымі падчас экскурсіі, таму што потым вам неабходна будзе выканаць тэставае заданне.

**ІІ. Пазнавальна-аперацыйны этап.**

**1.** *Экскурсія па музеі. Паведамленні настаўніка, экскурсавода і вучняў.*

**1 зала**

**Падрыхтаваны вучань (*чытае на памяць урывак – словы І.П.Мележа).***

"Ёсць у кожнага свой, мілы сэрцу, куток, які з бегам часу не толькі не цьмее ў памяці, а становіцца як бы яснейшым, даражэйшым. Багата можа быць у чалавека за жыццё і іншых куткоў, і больш слаўных, і больш выдатных, але гэты куток і не слаўны, і не выдатны, можа, нічым, не забываецца, не адступае ўдалеч сярод дарагіх, хвалюючых успамінаў – ён самы дарагі, самы шчымлівы! Куток гэты – тая хата, дзе мы вучыліся бегаць, дзе чулі цеплыню матчыных рук і цеплыню сэрца, куток нашага маленства".

**Экскурсавод.** Такім дарагім і мілым сэрцу кутком для І.П.Мележа стала вёска Глінішча Хойніцкага раёна, дзе ён нарадзіўся 8 лютага 1921 года. Гэта была звычайная для палескіх мясцін вёска паміж лясоў і балот. Іван Мележ з дзяцінства палюбіў прыроду роднага Палесся, яго працавітых людзей.

**Настаўнік**. Акрамя хараства родных краявідаў, хлопчык убіраў у сябе і тыя маральныя законы, па якіх жылі яго землякі. Прыкладам жыццёвай мудрасці, дабрыні і справядлівасці для Івана Мележа найперш была яго **маці Марыя Дзянісаўна,** простая, звычайная сялянка. Яна ведала шмат народных песень і любіла спяваць. Гэта любоў да народнай песні перадалася і сыну.

**Экскурсавод.** А прыкладам руплівасці і гаспадарлівасці быў бацька Мележа – **Павел Фёдаравіч (*паказвае на фотаздымак).*** На ўсю ваколіцу ён славіўся як таленавіты бондар: рабіў дзежкі, гонты, цабэркі, устаўляў дзверы і вокны ў новых хатах. На фотаздымках вы бачыце і іншых родных Івана Мележа ***(называе іх).***

Сам Іван Мележ з дзяцінста таксама быў уцягнуты ў працу: пасвіў свіней, кароў, коней, працаваў на полі, на лузе, у лесе. Ад бацькі ён пераняў і некаторыя бондарскія навыкі (***расказвае пра драўляны веласіпед)***.

**Настаўнік**. А потым была вучоба. Найперш у пачатковай школе ў вёсцы Глінішчы **(*звяртаецца да фотаздымка)***, потым у сямігодцы ў Алексічах, а затым у Хойніцкай дзесяцігодцы, якую Мележ скончыў з залатым медалём.

Трэба адзначыць, што вялікую ролю ў духоўным сталенні будучага пісьменніка адыгралі яго настаўнікі: першая настаўніца **Праскоўя Андрэеўна Дашко,** светлы воблік якой стаў прататыпам Парaскі ў раманах "Подых навальніцы" і "Завеі, снежань", а таксама настаўнік Хойніцкай дзесяцігодкі **Міхаіл Іванавіч Пакроўскі,** які адчуў у сваім выхаванцы пісьменніцкі талент, прачытаўшы яго вершы. Ён параіў Мележу не кідаць пісаць, а працаваць сур'ёзна далей. Гэта акрыяла юнака, і ўжо ў **1939 годзе** ў газеце "Чырвоная змена" быў надрукаваны першы верш Івана Мележа **"Радзіме"**.

***Экскурсавод прапануе перайсці ў 2 залу.***

**2 зала**

**Экскурсавод.** У 1939 годзе Іван Мележ стаў студэнтам Маскоўскага інстытута філасофіі, літаратуры і гісторыі, але амаль адразу быў прызваны ў армію. Служыў спачатку у Дамбасе, потым у Карпатах, дзе і сустрэў вайну.

З першых дзён вайны юнак трапіў на фронт, ваяваў пад Уманню, Нікалаевам, Растовам-на-Доне. Летам 1942 года асколкам бомбы Мележ быў цяжка паранены ў правае плячо, ледзь не страціў руку. А ўратаваў яго растоўскі хірург Антонаў, які не дазволіў ампутаваць руку маладому хлопцу і правёў аперацыю.

**Настаўнік**. У час вайны ў франтавых умовах Мележ вёў дзённік. Але не ўсе яго запісы захаваліся. Частку дзённікаў ён закапаў на месцы дыслакацыі палка, частку адвёз у родную вёску Глінішча, калі прыязджаў у водпуск. На жаль, хата бацькоў Мележа згарэла разам з дзённікамі, не ўдалося адшукаць і тыя, якія закапаў. Засталася толькі частка: дзённікі, якія ён вёў у час адступлення.

Як адзначаў сам пісьменнік, з гэтых дзённікавых запісаў па сутнасці пачалася яго творчая праца як празаіка. У **1969 годзе** быў апублікаваны дзённік **"У пачатку вайны".** Асобным выданнем ваенны дзённік Мележа пабачыў свет ужо пасля смерці пісьменніка пад назвай **"Першая кніга" (*дэманструе яе).***

**Экскурсавод.** Пасля ранення Мележ лячыўся спачатку ў растоўскім, потым у тбіліскім шпіталях. Тут, у тбіліскім шпіталі, левай рукой ён напісаў свае апавяданні **"Сустрэча"** і **"Апошняя аперацыя".**

Калі Мележа камісавалі па стане здароўя, ён трапіў у заволжскі гарадок Бугуруслан. Там паступіў у педагагічны інстытут, супрацоўнічаў у мясцовай газеце.

Кватараваў камісаваны франтавік у Клаўдзіі Іванаўны Пятровай. Яе дачка Ліда і юнак з Палесся пакахалі адзін аднаго і ў хуткім часе ажаніліся. З часам у сям'і нарадзіліся дзве дачкі – Людміла і Ларыса.

**Настаўнік**. У 1943 годзе Мележ перавёўся ў Падмаскоўе, дзе завочна вучыўся на філалагічным факультэце БДУ. У 1944 годзе разам з універсітэтам Мележ з сям'ёй вярнуўся ў Беларусь. З гэтага часу і да канца сваіх дзён ён жыў у Мінску. Дарэчы, мэбля і рэчы, якія бачыце ў гэтым пакоі (кніжная шафа, канапа, крэслы, пісьмовы стол, друкарская машынка) былі перавезены ў музей з мінскай кватэры пісьменніка.

У 1944 годзе ў газеце звязда было апублікавана **першае апавяданне** Мележа – **"Сустрэча".** Праз год ён скончыў універсітэт і паступіў у аспірантуру. Але замест навуковай працы напісаў шэраг апавяданняў, якія склалі яго першую кнігу **"У завіруху**" (1946 год).

**Экскурсавод.** Я хачу паказаць вам гэтую кнігу. На першай старонцы рукой самога Мележа напісана прысвячэнне сваім бацькам (***зачытвае яго).***

**Настаўнік**. У 1946 годзе Іван Мележ напісаў свой першы буйны твор (аповесць **"Гарачы жнівень**"), які даў назву другому зборніку.

А ў 1947 годзе пісьменнік пачаў працу над вялікім эпічным палатном – раманам **"Мінскі напрамак".** Гэта твор пра вызваленчую барацьбу на Беларусі ў 1944 годзе, пра велічнасць народнага подзвігу.

**Экскурсавод.** А самай галоўнай у творчасці Івана Мележа стала яго **“Палеская хроніка”,** працаваць над якой ён пачаў з сярэдзіны 50-х гадоў.

У 1961 годзе выйшаў першы раман **“Людзі на балоце”,** які з захапленнем сустрэлі чытачы. У 1962 годзе раман быў адзначаны Літаратурнай прэміяй імя Якуба Коласа.

**Настаўнік** *(звяртаецца да вучняў).* Вы павінны былі папярэдне пазнаёміцца з гісторыяй назвы гэтага твора. Што вы даведаліся? *(Паведамленні вучняў).*

**Экскурсавод.** У 1965 годзе была надрукавана другая кніга “Палескай хронікі” – **“Подых навальніцы”.** А ў 1972 годзе за гэтыя 2 кнігі І.Мележу была прысуджана Ленінская прэмія.

У 1976 годзе выйшла трэцяя кніга – **“Завеі, снежань”.** У накідах засталіся яшчэ 2 кнігі: **“За асакою бераг”** і **“Праўда вясны”.**

**Настаўнік.** “Палеская хроніка стала вельмі значным творам у спадчыне Івана Мележа. Як успамінаў пісьменнік, *“я не мог – рана ці позна – не напісаць гэтыя раманы “Людзі на балоце” і “Подых навальніцы”, бо насіў іх у сабе як радасць і пакуту доўгія гады… Родная вёска, людзі, маё юнацтва – усё гэта жыло ў маім сэрцы і не давала спакою”.* Невыпадкова прысвячэннем да рамана “Людзі на балоце” сталі словы “Бацьку, маці, бацькоўскай зямлі”.

***Экскурсавод прапануе перайсці ў 3 залу.***

**Экскурсавод.** Тут вы бачыце асабістыя рэчы І.П.Мележа (***называе іх***), фотаздымкі, успаміны сяброў-пісьменнікаў, ганаровыя граматы, віншавальныя тэлеграмы, паштоўкі. Хачу звярнуць вашу ўвагу на фотаздымкі, прысвечаныя экранізацыі раманаў “Палескай хронікі”. Фільм выйшаў у 1982 годзе, рэжысёрамі яго выступілі Віктар Тураў і Дзмітрый Зайцаў. Ролю Васіля Дзятла выканаў Юрый Казючыц, ролю Ганны – Алена Барзова (***дэманструе фотаздымак),*** бацьку Ганны сыграў Генадзь Габрук.

Таксама раманы неаднаразова ставіліся на сцэнах розных тэатраў краіны (***дэманструе фотаздымкі).***

**Настаўнік.** У апошнія гады жыцця Мележ займаўся не толькі літаратурнай, але і грамадскай працай: працаваў у апараце ЦК КПБ, выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Увесь час ён імкнуўся пазбавіцца пасад, хацеў займацца толькі творчасцю.

У 1972 годзе І.П.Мележу было нададзена званне народнага пісьменніка БССР.

**Экскурсавод.** Здароўе Мележа пагаршалася. Ён, мусіць, разумеў, што лёс адмераў яму няшмат часу, таму напружана працаваў. Яму вельмі хацелася завяршыць “Палескую хроніку”. Вясной 1976 года ў Мінску адбыўся творчы вечар І.П.Мележа, куды ён запрасіў сваіх землякоў – хор з вёскі Глінішчы. Яны спявалі яго любімыя песні, сярод іх – “Шумяць вербы ў канцы грэблі”. Мележ слухаў іх са слязьмі на вачах.

***(2 вучні чытаюць на памяць верш)***

**1 вучань.**Хвалебстваў суняўся віхор,

Ацiх і знямеў у пашане.
І вось перад публікай хор —
Яго землякі, глінішчане.
Ён сам запрасіў і ўпрасіў —
Прыехаць іх з песняй пра вербы.
Іначай ён вечар зусім
Адменіць, як тлум непатрэбны.
Падпёршыся цяжка рукой,
Сядзіць ён наводшыбе ў ложы:
Самотны — як вечны спакой,
Як казачны волат — прыгожы.
А песня з бацькоўскай зямлі
Ужо разанула па сэрцы.
І вочы імглой заплылі —
Вымае хусцінку, каб сцерці.
Славуты былы партызан
Да сябра свайго нахіліўся:
— Ён плача. — Хто плача? — Іван
— Ад песні? Чуллівы зрабіўся!..

**2 вучань** У зале, дзе цесна сядзім
І чуем свае вербалозы,
Ён ведае толькі адзін,
Чаго пакаціліся слёзы.
У муках бяссонных начэй
Адчуў ён па прыступах болю:
«Калі не пазваць як хутчэй —
То ўжо не пачую ніколі...»
З той залы мы выйшлі ў вясну.
А летам, для ўсіх нечакана,
Хвароба паклала ў труну
Палескай зямлі велікана.
І быў у абліччы відзён
След думы, застылай у плоці:
Да ўздыху апошняга ён
Жыў лёсам людзей на балоце.

**Настаўнік.** Праз некалькі месяцаў пасля гэтай сустрэчы, **9 жніўня 1976 года,** жыццё І.П.Мележа раптоўна абарвалася. Цяжка было паверыць у смерць гэтага славутага песняра Палесся, што пражыў толькі 55 гадоў. Паэт Генадзь Бураўкін напіша пра гэта жалобны верш “Не веру!” (***вучань чытае на памяць).***

Не можа быць!
Не веру!
Не хачу!
Адкіну прэч жалобную паперу.
Ні ворагу, ні сябру, ні ўрачу
Ніколі не паверу, не паверу.
Не могуць ні хвароба, ні вайна
Ад нас яго забраць,
Не маюць права.
Навекі з ім турбота ў нас адна,
Адна ў нас незавершаная справа.
Зямліцы роднай ён так шмат аддаў
Крыві, здароўя, таленту і працы,
Што забіраць яго ад ніў і траў
Яна, матуля, не магла спяшацца.
Не веру я бязлітаснай жарстве,
Што холадам магільным рукі коле.
Ён ёсць!
Ён ёсць!
Ён з намі,
Ён жыве,
Ён нежывым не можа быць ніколі!

**Настаўнік.** Так, сапраўды, пісьменнік жыве ў сваіх творах. А зараз я прапаную вярнуцца ў імправізаваны клас, каб працягнуць наш урок.

**2.** *Выкананне заданняў на фарміраванне чытацкай граматнасці вучняў.*

**1) “Воблака слоў”:** вучням неабходна выбраць з “воблака слоў” тыя словы, якія звязаны з тэматыкай і праблематыкай рамана “Людзі на балоце”, і аформіць кластар (*на картках).*

**Тэматыка і праблематыка рамана “Людзі на балоце”**

Жыццё палескай вёскі 1920-х гг.
калектывізацыя
тэма кахання
пошукі шчасця
тэма прыроды
чалавек і ўлада
чалавек і зямля
традыцыі і звычаі палешукоў

**Праца з тэкстам.**

**1.** Вучні чытаюць уголас урывак з рамана (стар. 186 - 188).

*Увесь дзень перад «святым вечарам» маці шкрабла нажом стол, лавы, мыла ўсё. Ад ранку ледзь не да самага вечара не тух у печы агонь, варыла, варыла, пякла. Вячэра мусіла быць посная, але ж трэба было згатаваць ні мала ні многа: дванаццаць страў!*

*Маці не ела ўвесь дзень і другім не давала. Міканор адрэзаў скібу хлеба, сам дастаў гуркоў і тым перабіў голад. Яна бачыла гэта, але не сказала нічога, толькі перахрысцілася на абразы: і маці, і сын нібы загадзя бачылі марнасць спрэчак і не вельмі стараліся ўсчынаць іх.*

*Толькі як добра сцямнела ў хаце, унесла рэшата з сенам, паклала на покуце; паставіла наверх гаршчок з куццёю.*

*- Выперлася еты год цераз край! - сказала пра куццю, што распарылася ў печы. - Добры ўраджай на збожжа павінен буць!*

*- Дай Бог! - сказаў бацька.*

*З пашанай і нейкай урачыстасцю сачыў бацька, як матка слала на вымытым стале сена, як накрывала яго чыстым настольнікам, як клала бохан хлеба, нож, лыжкі, ставіла конаўку з соллю. Памыўшы ў кутку над цэбрам рукі, ён, белы, у лапцях, у зрэбных штанах, у доўгай, да кален, сарочцы, падпяразанай святочным паяском, пачакаў, калі падыдзе маці, і, не глянуўшы на Міканора, першы момант няёмка, стаў голасна маліцца...*

*За сталом матка і бацька сядзелі, вячэралі як ніколі маўкліва, нібы чулі за сабою цені тых, хто даўно ўжо не прасіў яды. Абое, было відаць, думалі, успаміналі; бацька, перш чым браць якой стравы самому, адліваў лыжку яе ў міску, пастаўленую на акне, дзядам, нябожчыкам. Маці сядзела за сталом, толькі перастаўляла міскі, нічога не прыбірала. Вячэра здалася Міканору вельмі доўгаю і сумнаю; ён ледзь дачакаўся, калі бацька нарэшце паставіць на стол гаршчок з куццёю, нальe салодкай вадзіцы-сыты з маку і мёду, паспытаўшы якія, можна, не крыўдзячы старых, устаць...*

*Калі адзяваўся, каб пахадзіць па марознаму вячэрняму двару, заўважыў: непустыя міскі пасля вячэры так і асталіся на стале - каб дзядам было чаго пад'есці!..*

**2.** Аналіз прачытанага:

- Звычаі якога свята адлюстраваныя ў гэтым урыўку? (*Каляды).*
- Што вам вядома пра Каляды? (*Ва ўсходніх славян Каляды адзначаліся з 6 па 21 студзеня. У гэты час вечары лічыліся святымі: у іх забаранялася працаваць, акрамя работ па гаспадарцы. Вячэра ў першы дзень Каляд называлася "куццёю", таму што ў гэты дзень абавязкова варылі куццю – кашу з ячных круп. На працягу Каляд адзначалася 3 куцці:* ***першая (посная), "вялікая куцця"*** *– 6 студзеня,* ***другая(шчодрая)*** *– 13 студзеня (хадзілі па хатах і шчадравалі, гатавалі мясныя стравы) і* ***трэцяя (вадзяная)*** *– 18 студзеня).*
- Давайце звернемся да тэксту. Якія калядныя абрады і звычаі тут адлюстраваны? (*Маці прыбірае хату, варыць куццю, гатуе 12 страў, на стол кладуць сена, засцілаюць яго чыстым абрусам; бацька моліцца за нябожчыкаў, нябожчыкам-дзядам адліваюць ежу ў міску, пакідаюць на стале).*

- Як вы думаеце, што хацеў сказаць Іван Мележ пра палешукоў, апісваючы гэтыя абрады і звычаі? (*Хацеў паказаць, што палешукі з павагай адносіліся да сваіх продкаў, ведалі і шанавалі іх звычаі).*

- Якія з гэтых звычаяў і традыцый захаваліся да нашага часу? (*Прыбіраюць хаты да свята, вараць куццю, шчадруюць па хатах калядоўшчыкі).*

- Якую назву можна даць гэтаму ўрыўку? *(Адказы вучняў).*

**2) "Лінгвістычны дослед":** прачытаць урывак з рамана (стар. 31 – 33) і
падабраць да агульнаўжывальных слоў дыялектныя словы. Запоўніць табліцу (*на картках).*

| **Агульнаўжывальныя словы** | **Дыялектныя словы** |
|---|---|
| ужо | ужэ |
| яшчэ | шчэ |
| бульба | картопля |
| буць | быць |
| дзядзечка | дзядзечко |
| гэта | ето |
| мабыць | мабуць |

- Як вы думаеце, для чаго аўтар ужывае гэтыя словы? *(Каб перадаць мясцовы каларыт, трапнасць мовы палешукоў).*

**ІІІ. Дыягнастычна –карэкцыйны этап.**

*Выкананне тэставага задання. Узаемаправерка, выстаўленне адзнак.*

**ІV. Кантрольна-ацэначны этап.**

**1.** Падвядзенне вынікаў урока.
- Пра каго мы сёння гаварылі на ўроку?
- Ці ўдалося нам засвоіць тэму ўрока?

**2.** Рэфлексія.

*Вучням прапануецца дапоўніць прапанаваныя фразы, каб атрымаўся "Ліст падзякі", які будзе захоўвацца ў кнізе водгукаў музея.*

**3.** Інфармацыя пра дамашняе заданне: *напісаць міні-сачыненне "Экскурсія ў Дом-музей І.П.Мележа".*

**Воблака слоў**




## Тэставае заданне

**1.** Якія з ніжэйпералічаных дат адпавядаюць гадам жыцця і творчасці Івана Паўлавіча Мележа?

а) 1921—1976;
б) 1917—1995;
в) 1914—1978;
г) 1912—1995;
д) 1930—1984.

**2.** «*Ёсць у кожнага свой, мілы сэрцу куток, які з бегам гадоў не толькі не Цьмее ў памяці, а становіцца як бы яснейшым, даражэйшым... куток нашага маленства»,* – з любоўю і цеплынёй сказана І.Мележам пра родныя мясціны. Назавіце іх.

а) Вёска Пількаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.
б) Вёска Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.
в) Вёска Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.
г) Вёска Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці.

**3.** Навучальныя ўстановы, у якіх вучыўся І. Мележ:

а) Пачатковая школа ў Глінішчах;
б) Бягомльская сямігодка;
в) Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры;
г) Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**4.** І. П. Мележ

а) не меў ніякага ганаровага звання, звязанага з творчасцю,

культурай і адукацыйнаасветніцкай дзейнасцю

б) меў ганаровае званне народнага паэта Беларусі;

в) меў ганаровае званне народнага артыста Беларусі;

г) меў ганаровае званне заслужанага настаўніка Беларусі;

д) меў ганаровае званне народнага пісьменніка Беларусі.

**5.** Асноўнай галіной творча-пісьменніцкай дзейнасці ў І.Мележа з'яўлялася:

а) паэзія;

б) проза;

в) драматургія;

г) мемуарыстыка;

д) літаратурная крытыка.

**6.** Самай вядомай мастацкай рэччу І.Мележа, своеасаблівай візітнай карткай для яго як пісьменніка (паэта) стала (стаў):

а) апавяданне "На скрыжаванні";

б) п'еса "Дні нараджэння ";

в) раман "Мінскі напрамак";

г) раманная трылогія "Палеская хроніка”.

**7.** Як увайшоў у жыццё І.Мележа гэты далёкі заволжскі горад?

а)Апынуўся ў Бугуруслане пасля лячэння ў шпіталі; працаваў ваенруком у педінстытуце і адначасова вучыўся завочна ў гэтай навучальнай установе. Тут ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Лідзіяй Пятровай, з якой у 1946 годзе ажаніўся.

б)Працаваў у адной са школ, дзе пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай, з якой у 1943 годзе ажаніўся.

**8.** Вызначце праблемы рамана «Людзі на балоце» І.Мележа:

а) каханне;

б) барацьба за ахову прыроды;

в) барацьба з фашыстамі;

г) жыццё палескай вёскі 1920-х гадоў.

**9.** Якую назву мае другі раман «Палескай хронікі»?

а) «Завеі, снежань»;

б) «У палескай глушы»;

в) «Подых навальніцы»;

г) «На ростанях»;

д) «У глыбі Палесся».

**10.** Якія раманы «Палескай хронікі» засталіся недапісанымі, толькі ў накідах?

а) «Людзі на балоце»;

б) «Праўда вясны»;

в) «Подых навальніцы»;

г) «Завеі, снежань»;

д) «У палескай глушы»;

е) «У глыбі Палесся»;

ё) «За асакою бераг».

**Адказы:** 1 - а; 2 - б; 3 - а, в, г; 4 - д; 5 - б, 6 – г; 7 – а; 8 – а, г; 9 – в; 10 – б, ё.

**Ліст падзякі**

Сёння, 17 кастрычніка 2024 года, мы наведалі Дом-музей І.П.Мележа.

Мы рады, што ______________________________________________.

Экскурсія была ____________________________________________.

Асабліва нас уразілі _______________________________________

_______________________________________________________________.

Мы ганарымся тым, што _____________________________________.

Вялікі дзякуй за __________________________________________.

Жадаем музею ______________________________________________

_______________________________________________________________.

Вучні 10 класа ДУА "Сярэдняя школа № 3 г. Хойнікі"

**Сцэнарый інтэрактыўнай пляцоўкі "Глінішчанскае падвор'е"**

Мэта: пазнаёміць удзельнікаў з культурнымі традыцыямі Хойніцкага раёна, паспрыяць выхаванню пазітыўнага стаўлення да нацыянальнай спадчыны і культуры.

Ход мерапрыемства

*Дзеянне адбываецца на адкрытай пляцоўцы "Сялянскае падвор'е". Тэрыторыя разбіта на пяць лакацый (прыпынкаў). Удзельнікамі з'яўляюцца госці семінару, якія пераходзяць ад аднаго прыпынка да другога.*

*Вядучыя апрануты ў беларускія нацыянальныя касцюмы. Гучыць беларуская музыка ("Весялуха").*

*Вядучыя сустракаюць гасцей.*

**Вяд.1** - Што, сябры, для жыта трэба?

**Вяд.2** - Ну, вядома, трэба глеба.

**Вяд.1 -** А для птушкі?
**Вяд.2** - Вышыня.
**Вяд.1** -А для казкі?
**Вяд.2** - Цішыня
**Вяд.1** - Ну, а што для весялосці?
**Вяд.2** - Каб часцей бывалі госці!
**Вяд.1** Добры дзень, паважаныя госці! Мы вельмі рады вітаць вас на роднай глінішчанскай зямлі! Запрашаем вас у невялікае падарожжа, каб лепш даведацца пра наш гасцінны край і слаўных землякоў!

*Гучыць беларуская музыка. Госці пад ручніком праходзяць на першы прыпынак.*

**Прыпынак "Гастранамічны"**

*На сталах, прыгожа ўбраных, стаяць стравы, якія гатуюцца толькі ў в. Глінішчы або ў Хойніцкім раёне. Ля стравы прыгожа раздрукаваныя рэцэпты. Вядучыя вітаюць гасцей.*

**Вяд.1** У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: "Калі ласка!.."
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
– Калі ласка, калі ласка, ў хату!
**Вяд.2** Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!

*Вядучыя прапануюць гасцям пакаштаваць стравы. Прэзентацыя рэцэптаў.*

**Прыпынак "Пазнай Беларусь"**

*Вядучыя вітаюць гасцей.*

**Вяд.1** Хіба можна кут не любіць,
Дзе твае нарадзіліс бацькі,
Дзе жыццё пражылі дзяды,
Дзе спрадвеку твае карані?
**Вяд. 2** Любы край Беларуссю завецца,
І няма за яго мілей.
І старым, і малым тут утульна,
З кожным годам жывецца мажней.

*П. Броўка*

*Перад гасцямі карта Беларусі, на якой патрэбна размясціць самыя вядомыя прадпрыемсты і беларускія брэнды. Назвы надрукаваны на асобных картках.*

**Прыпынак "Час для гульні"**

*Вядучыя вітаюць гасцей.*

**Вяд.** Народныя гульні – гэта такая ж частка культурнай спадчыны краіны, як песні, танцы, казкі, легенды. У гульнях адлюстроўваецца душа і характар

кожнай нацыі. Яны былі важным элементам традыцыйных святаў, сямейных сустрэч і проста вясковых вечарын. Не сталі выключэннем і нашы землякі. Мы таксама вельмі любім пагуляць. Зараз нашы ўдзельнікі вам пакажуць, як можна зацікавіць дзяцей пагуляць на вуліцы, каб яны менш часу праводзілі ў "Цік-току" або іншых месэнджарах.

*Дэманструецца гульня* ***"Гарлачык"*** *(удзельнікі – дзеці).*

**Ход гульні**

*Дзеці сядзяць у крузе на кукішках. Гэта "гарлачыкі". Па крузе ходзіць пакупнік. Спыніўшыся каля каго-небудзь, ён пытаецца:*

- Колькі каштуе гарлачык?

*Дзіця адказвае:*

- За гарлачык гэты
Дай нам зусім крышку:
Каб ніколі не хварэць -
Маннай кашы лыжку.

*Пасля гэтых слоў "гарлачык" паднімаецца і бяжыць па крузе ў адным напрамку, а пакупнік – насустрач яму. Кожны імкнецца заняць свабоднае месца. Той, хто спазняецца, становіцца пакупнікам.*

**Прыпынак "Наш зямляк Іван Мележ"**

*Вядучыя вітаюць гасцей.*

**Вяд.1.** Якую трэба мець адданасць
І сэрца сынава, каб так
Любіць палескі край туманны
І маці белы андарак.
Якую мужнасць мець патрэбна,
Каб хуткасці наперакор
Уваскрасіць і воблік зрэбны
Сяла, і водбліск даўніх зор.

*П.Панчанка "Зямля бацькоў"*

**Вяд.2** Напэўна нашы госці здагадаліся пра каго пойдзе размова? Так, сапраўды, гэта наш зямляк, наш гонар Іван Паўлавіч Мележ. Мы прапануем вам прыняць удзел у нашай невялікай віктарыне і адказаць на некалькі пытанняў.

1. Дзе нарадзіўся Іван Паўлавіч Мележ?
2. Як называецца самы знакаміты твор І.Мележа?
3. Каму прысвяціў пісьменнік гэты твор?
4. Як называецца вёска, дзе разгортваюцца падзеі рамана?
5. Як называецца другая кніга палескай хронікі?
6. Якой прэміяй быў адзначан раман «Людзі на балоце»?
7. Назавіце буйны празаічны твор, дзе І. Мележ расказвае аб вызваленні Беларусі ад нямецкіх захопнікаў.

*Адказы на пытанні патрэбна знайсці ў філвордзе.*



*Напрыканцы гасцям прапануецца паглядзець некалькі інсцэніровак, якія пакажуць вучні.*

**Вяд.1** Паважаныя госці, ці спадабалася вам у нас? Каб ваш добры настрой захаваўся надоўга, мы пакажам вам некалькі глінішчанскіх смяшынак-весялушак.

*Інсцэніроўкі адна змяняюць другую*.

Жылі-былі два суседы. Адзін вырашыў паднавіць плот. Кажа сыну:

-Ідзі да суседа, пазыч малатка.

Пайшоў сын:

-Бацька просіць, каб вы малатка далі.

- А якія цвікі вы забіваць будзеце – жалезныя ці драўляныя?

Хлопец падумаў трохі, адказвае:

-Жалезныя.

- То скажы бацьку, што ў мяне няма жалезнага малатка, а ёсць драўляны.

- Бачыш, які скупы, пашкадаваў даць, трэба свайго дставаць…

У адной глінішчанкі ажаніўся сын. Узяў дзяўчыну з далёкага сяла. Неяк пасля вяселля маладая гаспадыня пытаецца ў свекрыві:

-Як у вас курэй клічуць?

Тая адказвае:

-Як у вас, так і ў нас.

Пайшла нявестка курэй карміць і кліча іх:

-Як у вас, так і ў нас. Як у вас, так і ў нас. Як у вас, так і ў нас…

Сустракаюцца два падарожнікі.

-Зойдзем вунь у тую хатку, - паказвае адзін, - нам там дадуць малака! І нап'ёмся і пад'ядзім!

- А вось і не вып’еш, - пярэчыць яму другі.
-Чаму?
-Таму, што я пасалю тое малако!
-Навошта?
-Каб ты не выпіў!
-Пасоліш?
-Пасалю!
-Паспрабуй толькі! Дык я цябе гэтым кіем выцну!
-А я ўцяку!
-А я даганю!
-Не дагоніш, бо я на ногі прутчэйшы!
-Ах, не даганю? - раззлаваўся падарожны, - дык я цябе зараз паб’ю!
Пачалася бойка. Раптам на ганак выходзіць гаспадыня.
- Ай, людцы добрыя, чаго вы б’ецеся?
- Ды вось ён кажа, што не дасць мне малака напіцца!
- А дзе ж ты яго возьмеш?
- Дык у цябе.
- А ў мяне і каровы няма!
**Вяд.1**
Ці ўсё ў нас добра атрымалася?
Як вам, госцікі, спадабалася?
І шкада, а ўсё ж бывайце!
Нас, глінішчукоў, не забывайце!
**Вяд.2** А цяпер прыйшло імгненне вам сказаць: “Да пабачэння!”

*Гучыць песня «Бывайце здаровы»*

## Факультатыўны занятак “Лінгвістычная мазаіка”

**Мэта і задачы:** узнавіць, паглыбіць і замацаваць веды вучняў па пройдзеных у 5 класе тэмах; удасканальваць уменні выразнага чытання тэкстаў, арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі вучняў; спрыяць выхаванню культуры вуснага і пісьмовага маўлення, самастойнасці і адказнасці, любові і павагі да роднай мовы.

**Тып заняткаў:** паўтарэнне вывучанага.

**Абсталяванне:** мультымедыйная ўстаноўка, карткі, раздатачны матэрыял.

### Ход заняткаў

– Добры дзень. Дзеці, звярніце ўвагу на малюнкі, якія размешчаны на дошцы. Як вы думаеце, каму яны прысвечаны? Так, правільна. Нашаму земляку, народнаму пісьменніку БССР І.П.Мележу і героям яго твораў.

– Сёння мы з вамі будзем працаваць з урыўкам “Першы іней” з рамана І.П. Мележа “Подых навальніцы”. Зараз крыху пагаворым пра пісьменніка. Вы добра ведаеце, што народны пісьменнік БССР І.П. Мележ нарадзіўся на

нашай малой радзіме 8 лютага 1921г. Бацька – Павел Фёдаравіч. Маці – Марыя Дзянісаўна. Дзяцінства Івана Паўлавіча нічым не адрознівалася ад сялянскіх дзяцей. Дапамагаў бацькам па гаспадарцы. На выдатна скончыў дзесяцігодку ў Хойніках. Быў знаходлівым і дапытлівым хлапчуком. Сам змайстраваў ровар на драўляных колах. І. П. Мележ ваяваў, быў паранены ў правае плячо. Стаў знакамітым дзякуючы сваёй “Палескай хронiцы”.

– Зараз мы з вамі прачытаем урывак “Першы іней” (вучні чытаюць урывак).

*Былі пагодныя дні. З сонцам ад ранку да вечара, з сінім небам. Днём яшчэ было цёпла, а пад вечар, калі чырвонае сонца сцякала за лес, апусцелая, няласкавая зямля стыла на холадзе. Пад поўнач бяліў яе іней, у ледзяныя звонкія раніцы і трава каля платоў і на выганах, і палі з загонамі яшчэ не скопанай бульбы, і панурыя, учарнелыя стрэхі – усё было па-зімоваму белае. Калі ўздымалася над чэзлым балотным алешнікам сонца, светлае, прамяністае, ад інею аставаліся толькі цемнаватыя плямы вільгаці. Неўзабаве знікалі і яны. Іней трымаўся яшчэ ў цені дрэваў і хат, трымаўся ўпарта, пакуль сонечная цеплыня не дабіралася і сюды. Неба гэтымі днямі сінела чыстае і глыбокае. Яно не было цяпер такое яркае, як раней, часта атульвала яго белаватая, нібы малочная, смуга, і яно здавалася бляклым, быццам выгаралым за ліпеньскую і жнівеньскую спёку. Сонца таксама было іншае. Аддаўшы амаль увесь свой пал лету, яно берагло рэшткі цяпла, грэла мала, але на дзіва лагодна і пяшчотна. Гэтай лагоднасцю і пяшчотай было напоўнена ўсё ў прыродзе, усе дні. У лагодным сонечным святле гарэлі сумным адвечным полымем ліпы і бярозы каля хат, дрэвы ў недалёкім лесе. Як сівізна ад былога, ад пражытага, бялела ўсюды павуціна. Яна вісела ў паветры, абчэплівала павялы і пасохлы бульбоўнік, калы і жэрдкі вакол агародаў, пажоўклыя кусты. Усё агартаў спакойны, стары, як свет, смутак развітання з цяплом, з летам, набліжэння слоты, халадоў.*

– Давайце ўспомнім: што называецца лексічным значэннем слова? Якія словы называюцца адназначнымі? Якія словы называюцца мнагазначнымі? (Адказы вучняў).

– Прагледзьце яшчэ раз тэкст. Лексічнае значэнне якіх слоў вам невядома? Давайце выпішам гэтыя словы. Як вы лічыце, што гэтыя словы могуць азначаць? (Адказы вучняў).

– Скажыце, куды мы можам звярнуцца, каб вызначыць лексічнае значэнне слова? (Адказы вучняў). Правільна, да тлумачальнага слоўніка. Зараз нагадаем, як працаваць са слоўнікавым артыкулам (вучні зачытваюць памятку). Праца са слоўнікам (знаходзім лексічнае значэнне слоў і зачытваем).

Заданне. Вызначце лексічнае значэнне наступных слоў. Словы і іх значэнне злучыце лініямі.

| | |
|---|---|
| Іней | Пачуццё суму, маркоты, жалю |
| Страха | Моцная гарачыня ў паветры, нагрэтым сонцам, спякота |
| Плот | Месца каля вёскі, дзе пасецца жывёла, птушка |

| | |
|---|---|
| Спёка | Від атмасферных ападкаў: ледзяныя крышталікі, якія ўтвараюцца ў выніку ахаладжэння вадзяной пары ў ясныя і ціхія ночы і асядаюць тонкім слоем на глебе, дрэвах і інш. |
| Выган | Агароджа вакол чаго - небудзь |
| Алешнік | Верхняя, звычайна саламяная, частка будынка, якая пакрывае яго і засцерагае ад атмасферных з'яў |
| Смутак | Альховы лес, зараснік альховых кустоў |

– Закончыць заняткі мне хацелася б словамі І. П. Мележа: “Мова – гэта вялікі народны скарб. Яго нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ”. Шануйце, паважайце родную мову, размаўляйце па-беларуску.

*Яўген Есіс,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” ДУА “Сярэдняя школа № 16 г. Мазыра”,*
*магістр філалагічных навук, даследчык педагагічных навук*

# “ВУЧЭБНЫ ПРАЕКТ: АД ДАСЛЕДАВАННЯ ДА ТВОРЧАСЦІ”

(майстар-клас)

**Мэта:** фарміраванне педагагічнай кампетэнцыі настаўніка праз трансляцыю вопыту выкарыстання метаду праектаў.

**Задачы:** прадставіць вопыт настаўніка па пазначанай тэме; арганізаваць узаемадзеянне ўдзельнікаў; стварыць умовы працы па развіццю творчай актыўнасці ўдзельнікаў майстар-класа; садзейнічаць развіццю ва ўдзельнікаў уменняў па арганізацыі, кантролі і рэфлексіі праектнай дзейнасці; садзейнічаць усведамленню ўдзельнікамі значнасці атрыманага досведу.

**Абсталяванне:** раздатачны матэрыял.

**Мэтавая аўдыторыя:** настаўнікі беларускай мовы і літаратуры.

**Чакаемыя вынікі:** разуменне сутнасці аўтарскай сістэмы; павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнцыі; рост матывацыі ўдзельнікаў майстар-класа да фарміравання ўласнага стылю творчай педагагічнай дзейнасці

## ХОД МАЙСТАР-КЛАСА

### 1. Арыенціровачна-матывацыйны этап

*Задача: забеспячэнне матывацыі ўдзельнікаў МК*

Адукаваны чалавек павінен быць мабільным і камунікабельным, умець планаваць уласную дзейнасць, працаваць з інфармацыяй, аналізаваць, абагульняць і прымяняць яе ў практычнай дзейнасці. У рэальнасці ж мы сутыкаемся са слабой матывацыяй вучняў, іх нздольнасцю да самастойнай пабудовы стратэгіі дзеля дасягнення мэты, з няўменнем працаваць з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі. Вучні адчуваюць цяжкасці пры вырашэнні вучэбных

задач з-за абмежаванасці моўных і маўленчых сродкаў. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым фактам, што ў сучасных навучэнцаў усё часцей назіраецца недастатковы ўзровень сфарміраванасці камунікатыўнай культуры.

**2. Актуалізацыя суб'ектнага вопыту ўдзельнікаў**

*Задача: забеспячэнне актыўнасці ўдзельнікаў МК.*

Мы разумеем, які выпускнік патрэбен. І ў той жа час усведамляем, якія цяжкасці могуць узнікнуць. Прапаную вам прагаласаваць зялёнымі карткамі, калі вы згодны з наступнымі сцвярджэннямі, альбо чырвонымі карткамі, калі ваш адказ адмоўны *(прыём "Святлафор")*.

*Ці можам мы адмовіцца ад урока як формы навучання?

*Ці маем мы магчымасць займацца індывідуальна з кожным навучэнцам, каб улічваць асаблівасці яго асобы?

*Ці можам мы цалкам адмовіцца ад функцыі настаўніка-транслятара ведаў?

*Ці азначае гэта, што ўрок павінен заставацца ранейшым?

*Каб дамагчыся вызначанага выніку, трэба, першым чынам, спрабаваць нешта прадпрымаць. Нельга вечна чакаць прыдатнага моманту, трэба проста стварыць яго. ТАК!

**3. Мэтавызначэнне**

*Задача: стварыць умовы для індывідуальнага мэтапакладання ўдзельнікаў.*

Відавочна, што школа сёння павінна не проста даваць веды вучням, але і развіваць іх крэатыўныя, камунікатыўныя якасці, вучыць вучыцца і размаўляць. Адказам на выклікі часу становіцца кампетэнтнасны падыход, які выводзіць на першае месца ўменні вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць у розных сітуацыях.

– ЯК АРГАНІЗАВАЦЬ УРОК КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫМ? *(Адказы ўдзельнікаў.)*

Значным інструментам развіцця кампетэнцый навучэнцаў можа стаць вучэбны праект. І мая мэта сёння – азнаёміць вас з асаблівасцямі арганізацыі працы вучняў над навучальным праектам у рамках ўрочнай дзейнасці.

А чаго вы чакаеце ад майстар-класа? Што б вы хацелі даведацца і чаму навучыцца? Як вы думаеце, што будзе вынікам нашай супольнай дзейнасці сёння?

| Хто? | Што? | Чаму? | Калі? | З якой мэтай? |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

**4. Аперацыйна-пазнавальны этап**

*Задачы: разгледзець вучэбны праект як інструмент сучаснага ўрока; забяспечыць практычную дзейнасць удзельнікаў па засваенні тэхнікі арганізацыі вучбнага праекту.*



***Заданне 1. Вызначце мэту сваёй дзейнасці.***

| *Хто?* | *Што?* | *Чаму?* | *Калі?* |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | |



***Заданне 2. Прачытайце прапапанаваную інфармацыю. З дапамогай # (хэштэга) прадстаўце вынікі сваёй дзейнасці.***

*Задачы: разгледзець вучэбны праект як інструмент сучаснага ўрока; забяспечыць практычную дзейнасць удзельнікаў па засваенні тэхнікі арганізацыі вучбнага праекту.*

***А.*** У аснове арганізацыі праектнай дзейнасці вучняў ляжыць метад вучэбнага праекта – адна з асобасна арыентаваных тэхналогій, спосаб арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў, накіраваны на вырашэнне задачы вучэбнага праекта, які інтэгруе ў сабе праблемны падыход, групавыя метады, рэфлексіўныя, прэзентатыўныя, даследчыя, пошукавыя і іншыя падыходы.

| ***#вучэбны_праект _*** |
| --- |

***Б.*** Вучэбны праект з пункту гледжання вучня – гэта магчымасць рабіць нешта цікавае самастойна, у групе ці самому, максімальна выкарыстоўваючы свае магчымасці; гэта дзейнасць, якая дазваляе праявіць сябе, паспрабаваць свае сілы, прыкласці свае веды, прынесці карысць і паказаць публічна дасягнуты вынік; гэта дзейнасць, накіраваная на вырашэнне цікавай праблемы, сфармуляванай самімі вучнямі ў выглядзе мэты і задачы, калі вынік гэтай дзейнасці – знойдзены спосаб вырашэння праблемы – носіць практычны характар, мае важнае прыкладное значэнне і, што вельмі важна, цікавы і значны для саміх адкрывальнікаў

| ***#вучань_*** |
| --- |

***В.*** Вучэбны праект з пункту гледжання настаўніка – гэта інтэгратыўны дыдактычны сродак развіцця, навучання і выхавання, якое дазваляе выпрацоўваць і развіваць асобасныя, прадметныя і метапрадметныя кампетэнцыі вучняў.

| ***#настаўнік _*** |
| --- |



***Заданне 3. У вучэбным праекце, як і ва ўсякай іншай дзейнасці, ёсць пэўная колькасць этапаў, якія ўяўляюць***

***сабой прыступкі на шляху да планаванага выніку. Калі ласка, вызначце па групах складнікі работы над вучэбным праектам: 1 – змест работы на дадзенай стадыі, 2 – дзейнасць вучняў).***

| *Стадыі работы над праектам* | *Змест работы на дадзенай стадыі* | *Дзейнасць вучняў* |
|---|---|---|
| Падрыхтоўка | | |
| Планаванне | | |
| Даследаванне | | |
| Аналіз і абагульненне | | |
| Прэзентацыя праекта | | |
| Ацэнка вынікаў і працэсу | | |

Група 1. ***Змест работы***

1. Аналіз інфармацыі, афармленне вынікаў, фармуліроўка вывадаў.
2. Асноўныя інструменты: інтэрв'ю, апытанні, назіранні, эксперыменты.
3. Вызначэнне крыніц інфармацыі; спосабаў яе збірання і аналізу.
4. Вызначэнне спосабу прад'яўлення вынікаў.
5. Вызначэнне тэмы і мэтаў праекта
6. Збіранне інфармацыі.
7. Магчымыя формы прадстаўлення вынікаў: вусная або пісьмовая справаздача.
8. Размеркаванне заданняў і абавязкаў паміж вучнямі.
9. Рашэнне прамежкавых задач.

Група 2. ***Дзейнасць вучняў***

1. Абмяркоўваюць праект з настаўнікам і атрымліваюць дадатковую інфармацыю.
2. Вызначаюць мэты.
3. Распрацоўваюць план дзеянняў.
4. Фармулююць задачы.
5. Выконваюць даследаванне, вырашаючы прамежкавыя задачы.
6. Аналізуюць інфармацыю, абагульняюць вынікі.
7. Абмяркоўваюць, здаюць справаздачу.
8. Калектыўнае абмеркаванне і самаацэнка.



***Заданне 4. Прааналізуйце праект "Чорнай Дамай: рэальнасць ці мроя", вызначце яго від, станоўчыя бакі і недахопы.***

**Этапы падрыхтоўкі і абароны праекта**

1. Праектная ініцыятыва.

Абмеркаванне тэмы праекта ("Чорнай Дамай: рэальнасць ці мроя"); вызначэнне накірунку дзейнасці (выкарыстанне

гісторыі пра няшчаснае каханне Жыгімонта II Аўгуста і Барбары Радзівіл у розных відах мастацтва).

2. Вызначэнне канчатковага рэзультату праекта.

Усведамленне выключнай важнасці мінулага для сучаснасці і будучыні.

3. Стварэнне груп і размеркаванне абавязкаў.

Кіраўнік праекта (ён жа кансультант), гісторыкі, фалькларысты, мастакі, журналісты, акцёры, літаратуразнаўцы, тэатральныя крытыкі, прыхільнікі музыкі, рамантыкі.

4. Распрацоўка групавога навучальнага маршруту.

Навошта? — каб набыць новыя веды, даказаць актуальнасць гісторыі дзён мінулых у дні сённяшнім; пра што даведаемся? пра інтэрпрэтацыю гістарычнага сюжэта ў розных відах мастацтва; каму раскажам? — усім, хто праявіць цікавасць.

5. Правядзенне мазгавога штурму.

Сабраць інфармацыю пра рэальныя падзеі, якія ляглі ў аснову гісторыі пра Чорную Даму. Пазнаёміцца з варыянтамі легенд пра Чорную Даму, супаставіць іх. Сабраць інфармацыю пра творы розных відаў мастацтва, заснаваныя на гісторыі кахання Жыгімонта II Аўгуста і Барбары Радзівіл. Наведаць спектакль Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы “Чорная панна Нясвіжа”. Супаставіць легенду, сучасныя літаратурныя і музычныя творы і спектакль.

6. Размеркаванне заданняў

7. Збор матэрыялу, кансультаванне настаўнікам.

8. Калектыўнае абмеркаванне выкананай работы. Выбар формы абароны праекта.

Справаздача з выкарыстаннем нагляднасці і элементаў інсцэніроўкі (паводле балад Я.Сіпакова “Просьба” і “Развітанне” з кнігі “Веча славянскіх балад”), драматычнай паэты “Барбара Радзівіл” Раісы Баравіковай, драмы “Чорная панна Нясвіжа” Аляксея Дударава.

9. Абарона праекта.

10. Рэфлексія.

Пытанне да ўдзельнікаў праекта: што Вы адчуваеце пасля сённяшняга “спаткання” з Чорнай Дамай?

**5. Рэфлексіўны этап**

*Задача: ацэнка эфектыўнасці ўзаемадзеяння педагога і ўдзельнікаў МК; вызначэнне значнасці атрыманых ведаў і ўменняў для выкарыстання ў далейшай дзейнасці.*



***А. Падбярыце і запішыце да кожнай літары слова ‘праект’ асацыяцыю-назоўнік.***

П – ______________________________________________

Р – ______________________________________________

А – ______________________________________________

Е – ________________________________________________

К – ________________________________________________

Т – ________________________________________________

***Б. Слова майстра.***

“... Калі думаеш пра дзіцячы мозг, уяўляеш далікатную кветку ружы, на якім дрыжыць кропелька расы. Якая асцярожнасць і пяшчота патрэбныя, каб, сарваўшы кветку, не выпусціць кроплю…” – слушна адзначыў В.Л. Сухамлінскі пра распрацоўку мадэлі праектаў.

Калі выкарыстоўваеш такі від дзейнасці ў сваёй працы, то павінен памятаць, што навучальны праект – гэта магчымасць рабіць вучню нешта цікавае самастойна, у групе ці самому, максімальна выкарыстоўваючы свае магчымасці;

***Яўсеенка Ірына Віктараўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі настаўнік-метадыст ДУА “ Рэчыцкі раённы ліцэй”***

**ТЭМА: Тэкст як сродак фарміравання чытацкай адукаванасці.**

**Мэта:** арганізацыя актыўнага педагагічнага ўзаемадзеяння для прэзентацыі сістэмы заданняў, якія спрыяюць развіццю чытацкай адукаванасці на ўроках беларускай мовы і беларускай літаратуры.

**Задачы:**

— стварэнне ўмоў для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў майстар-класа да азнаямлення з прыёмамі работы з тэкстам, якія садзейнічаюць развіццю чытацкай адукаванасці вучняў;

— дэманстрацыя прыёмаў для работа з тэкстам для фарміравання ўменняў, якія фарміруюць чытацкую адукаванасць вучняў;

— стварэнне ўласнага метадычнага прадукта, які будзе садзейнічаць фарміраванню чытацкай адукаванасці вучняў на аснове камунікатыўнага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі майстар-класа.

**Ход майстар-класа**

**I . Арганізацыйны этап**

Добры дзень, шаноўныя калегі!

Мы будзем сёння з вамі гаварыць пра тэкст , пра вялікія магчымасці малога тэксту і прыёмы, якія можна выкарыстоўваць для фарміравання чытацкай адукаванасці, працуючы на ўроку з тэкстам. Тэкст – гэта загадка, але гэта і разгадка, ключ да ўсіх моўных з’яў. Тэма нашага майстар-класа “Тэкст як сродак фарміравання чытацкай адукаванасці”.

**II. Матывацыйна-мэтавы этап**

Размеркаванне ўдзельнікаў майстар-класа на групы.

**Прыём “Падаруй кветку”**

*(Задача прыёма настроіць удзельнікаў на танальнасць майстар-класа, стварыць атмасферу добразычлівасці. Кожны ўдзельнік майстар – класа выбірае кветку рознага колеру з пажаданнямі).*

У гэты ж час я хачу, каб вы звярнулі сваю ўвагу на раздатку і пазнаёміліся з **прыёмам "Ліст чакання"**. Выберыце задачы, якія б вы хацелі рэалізаваць на працягу майстар-класа. Нумар (нумары) запішыце на адваротным баку:

1. Прааналізаваць умовы эфектыўнага выкарыстання прыёмаў, якія ўплываюць на фарміраванне чытацкай адукаванасці вучняў на ўроках мовы.
2. Азнаёміцца з некаторымі прыёмамі работы з тэкстам для фарміравання чытацкай адукаванасці праз іх дэманстрацыю і працу з імі.
3. Стварыць уласнае заданне, якое будзе садзейнічаць фарміраванню чытацкай адукаванасці вучняў на аснове камунікатыўнага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі майстар-класа.

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап**

**1.Прыём "Вітражы мудрасці".**

Я вельмі люблю цытаты ,таму звернемся да некаторых з іх і паспрабуем вызначыць тую, якая бліжэй да вас.

**Чытаць – гэта яшчэ нічога не значыць. Што чытаць і як разумець тое, што прачытаў – вось што галоўнае.**

***К.Дз. Ушынскі***

**Чытанне – гэта акт цывілізацыі, бо ён бярэ бясплатную сыравіну розуму і будуе замкі магчымасцей.**

***Бэн Окры***

2. Абазначце правільнае азначэнне чытацкай адукаванасці.

**1. Чытацкая адукаванасць – гэта ўзровень начытанасці, асэнсаванне чытацкага выбару, сістэматычнасць і паслядоўнасць чытання, веды пра аўтараў і кнігі, зацікаўленасць зберагчы і распаўсюдзіць інфармацыю, атрыманую шляхам чытанння.**

**2. Чытацкая адукаванасць – гэта здольнасць шукаць і здабываць інфармацыю з тэкстаў рознага зместу, інтэграваць і інтэрпрэтаваць, асэнсоўваць і ацэньваць паведамленні тэксту, здольнасць да выкарыстання прачытанага ў розных жыццёвых сітуацыях, у тым ліку для дасягнення сваёй мэты.**

**3. Чытацкая адукаванасць – гэта здольнасць распаўсюдзіць інфармацыю, атрыманую шляхам чытанння, шукаць і здабываць інфармацыю з тэкстаў рознага зместу, інтэграваць і інтэрпрэтаваць, асэнсоўваць і ацэньваць паведамленні тэксту.**

Калі мы выкарыстоўваем на ўроку тэкст, то выконваем умовы **"4 П":**

**ЧЫТАННЕ**
**РАЗУМЕННЕ**
**ІНТЭГРАЦЫЯ**
**АЦЭНКА**

Значыць, працуючы з тэкстам для развіцця чытацкай адукаванасці вучняў, заданні павінны быць накіраваны на тое, каб быў :

**1. пошук і знаходжанне інфармацыі;**

**2. ітнэграцыя і інтэрпрэтацыя інфармацыі;**

**3. ацэнка зместу і формы;**

**4. выкарыстанне інфармацыі з тэксту.**

Тэксты , якія мы выкарыстоўваем на ўроку, бываюць 4 відаў:

1.суцэльныя (гэта тэксты без візуалізацыі: дыктанты і пераказы);

2.несуцэльныя (графікі, дыяграмы, карты і г.д.);

3.камбінаваныя ;

4.састаўныя (некалькі відаў тэкстаў).

Прыёмы для работы з тэкстам па фарміраванні чытацкай адукаванасці можна выкарыстоўваць розныя:

“Лаві памылку”, “Карэктар”, “Самы ўважлівы”, “Лінгвістычны эксперымент”, “Антыцыпатыя”, “Клоўз-тэст”.

Майстар звяртае ўвагу на памятку па выкарыстанні прыёмаў работы з тэкстам для фарміравання чытацкай адукаванасці:

| **Умовы** | +/— |
|---|---|
| Сістэмнае выкарыстанне. | |
| Улік узроўню падрыхтаванасці, узросту, жыццёвага вопыту вучняў. | |
| Прыёмы павінны чаргавацца, утрымліваць элемент навізны. | |
| Нельга даручаць вучням самім рыхтаваць такія заданні, бо яны не маюць дастатковага вопыту. | |
| Гэтыя заданні павінны ствараць на ўроку атмасферу супрацоўніцтва і добразычлівасці. | |
| Стварэнне сітуацыі поспеху для кожнага вучня. | |

**IV. Інфармацыйна-дзейнасны этап**

*(Знаёмства і работа з тэкстам, прымяненне прыёмаў, што спрыяюць удасканаленню чытацкай адукаванасці, а таксама арганізацыя работы ў групах.)*

1. **Прыём “Антыцыпатыя”.**

Удзельнікам майстар-класа неабходна выказаць меркаванне пра тэкст “Блакітныя азёры”, не чытаючы яго.

2.Чытанне тэксту ў групах.




Блакітныя азёры

На паўночным захадзе Беларусі дзе сыходзяцца межы Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай вабласцей, размешчана

Балдуцкая группа азёр. Невялікія па плошчы, але глыбокія, азёры ўражваюць сваім хараством. Злучаныя паміж сабою ручаямі, яны **кажутся сказочными**. У тысяча дзевяцьсот семдзясят другім годзе дзеля аховы гэтага дзіўнага прыроднага комплексу быў створаны ландшафтны заказнік **« ? ».**

Хваёвыя лясы займаюць каля дзевяноста працэнтаў тэрыторыі заказніка. Растуць тут больш за пяцьсот відаў вышэйшых раслін, сярод якіх венерын чаравічак, баранец звычайны, занесеныя ў Чырвоную кнігу. Толькі тут у межах Беларусі сустракаецца меч-трава звычайная. Расце яна ў прыбярэжнай паласе на глыбіні да паўметра. Пустыя, амаль цыліндрычныя сцяблы гэтай расліны дасягаюць да паўтара метра. Меч-траву можна ўбачыць толькі ў азёрах Глубенька і Ячмянец.

Чыстая вада, маляўнічыя берагі азёр, лесістые ўзгоркі штогод прываблiваюць да сябе сотні турыстаў.

*Паводле С.Адзінцова, С.Сідора.*

**4. Прыём « Так ці не »**

1.Пазначце выказванні, дакладнасць якіх мы не можам пацвердзіць інфармацыяй з тэксту.

□ Беларусь – краіна азёр.

□ На тэрыторыі Беларусі існуе толькі адзін заказнік «Блакітныя азёры».

□ У Балдуцкую групу азёр уваходзіць самае вялікае возера Нарач.

□ Усе азёры Беларусі невялікія па плошчы, але глыбокія.

□ Меч-траву можна ўбачыць толькі ў азёрах Глубелька і Ячмянец.

2. Перакладзіце назвы раслін на беларускую мову і абазначце тыя расліны, пра якія ідзе гаворка ў тэксце.



Меч-трава



Клевер



Венерин башмачок



Ромашка



Баранец обыкновенный

**5.**Заданні для груп**:**

* Запішыце назвы жывёл, птушак, раслін, што ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.




*Куды, да якога месца, трэба браць білет, каб даехаць да заказніка “Блакітныя азёры” з горада Гомеля?



*Замалюйце на карце тыя вобласці, пра якія **НЕ** гаворыцца ў тэксце. Запішыце назвы тых абласцей, дзе размешчана Балдуцкая група азёр.




**6.Прыём "Лаві памылку", " Самы ўважлівы", "Лінгвістычны эксперымент".**

1. Запішыце лічэбнік 1972 словамі ў форме Т.скл.

2. Знайдзіце ў тэксце парушэнні арфаграфічнай і пунктуацыйнай нормы . Запішыце правільны варыянт .

3. Выпішыце прыметнік у простай вышэйшай ступені параўнання.

4. Выберыце правільны варыянт перакладу выдзеленага ў тэксце словазлучэння: **кажутся сказочными** – падаюцца казачнымі;
здаюцца казачнымі;
здаюцца казкавым.

5. Знайдзіце сказ, які адпавядае схеме :

___ , ___ , ___ ═══ .

___ ___ ___ ═══

**V. Практычны этап**

Арганізацыя работы ў групах: стварэнне ўласнага задання, якое б спрыяла развіццю чытацкай адукаванасці вучняў (на аснове прапанаваных настаўнікам матэрыялаў). Прэзентацыя ўласных заданняў удзельнікамі майстар-класа.

**VI. Этап падвядзення вынікаў**

**VII. Этап рэфлексіі**

**Прыём "SMS".**

Удзельнікі майстар-класа пішуць на стыкерах, якія атрымалі напачатку, свае пажаданні вядучаму.